Аддзел адукацыі, спорту і турызму
Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа № 1 г.п. Рось”

Конкурс юных журналістаў
“Ты ў эфіры”

# Духоўная спадчына Скарыны

Аўтар: Целеш Валерыя Сяргееўна,
9 клас, 15 год
Кіраўнік: Польцына А.М.,
настаўніца беларускай мовы і
літаратуры

Рось, 2017

Спачатку было слова…Як калыска,
Дзе дрэмле нараджэнне новых сфер,
Прыстанішча, дзе я жыву цяпер,
Ад вас удалечы- і гэтак блізка!

*М.Арочка ʻʻ Я родам – з Адраджэнняʼʼ*

2017 год праходзіць у Беларусі пад знакам вялікага асветніка і першадрукара Францыска Скарыны. 6 жніуня беларускае кнігадрукаванне адзначыла юбілейную дату. У гэты дзень, роўна пяцьсот год назад, мысліцель, вучоны і гуманіст- асветнік з Полацка Францыск Скарына адправіў у друк пераклад “Псалтыра” на старабеларускай мове, такім чынам даўшы пачатак беларускаму і ўсходнеславянскаму кнігадрукаванню. На працягу стагоддзяў гэта кніга Бібліі была асноўным падручнікам для дзяцей і душавыратавальнай кнігай для дарослых. Асветнік быў патрыётам, заўсёды прызываў помніць пра свой абавязак перад Радзімай. Ён падкрэсліваў, што абавязак кожнага чалавека працаваць на карысць сваёй краіны.

На сённяшні дзень вядома пра 25 найменняў кніг, якія надрукаваў Ф.Скарына. У дзесяці краінах захавалася 519 экземплярау гэтых выданняў. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі захоўваюцца дзесяць экземпляраў пражскіх выданняў першадрукара.

Дзякуючы кнігам нашага славутага земляка, мы, беларусы, атрымалі доступ не толькі да еўрапейскай, але і да агульнасусветнай інтэлектуальнай традыцыі.

Дзейнасць Скарыны ў многім прадвызначыла палітычнае, культурнае самавызначэнне нашага народа. Выданні славутага земляка аказалі значны ўплыў на развіццё многіх формаў культуры. Калі б першадрукар не заняўся друкарскай справай, то развіццё Вялікага княства Літоўскага і беларускага народа пайшло б зусім іншым шляхам.

Скарынаўская кніга таксама змяніла еўрапейскую прастору. Узняла культурны працэс эпохі Адраджэння на новую прыступку ў развіцці. Постаць асветніка значымая не толькі для нашага народа, але і для расійскай, і для агульнаславянскай гісторыі і культуры ў цэлым.

Незгасальны свет Скарыны- гэта той падмурак, на якім трымаецца нацыянальнае кнігаведавецтва. Штогод у нашай краіне выдаецца звыш за дзесяць тысяч найменняу кніг. Беларусь працягвае заставацца на лідзіруючых пазіцыях па колькасці чытаючых. У духоўным жыцці нашага народа кніга займае адно з самых выдатных месцау. Гэта прыдатная глеба, якая дазволіла будаваць суверэнную і незалежную Беларусь. Гэта адбываецца, дзякуючы дзяржаунай падтрымцы нацыянальнага кнігавыдавецтва на ўсіх узроўнях.

Юбілейную дату беларускага кнігадрукавання на працягу ўсяго 2017 года адзначаюць па ўсёй Беларусі шматлікімі выставамі, конкурсамі, тэматычнымі вечарынамі і іншымі мерапрыемствамі. Сёння імя Скарыны носяць навучальныя установы, бібліятэкі і грамадскія аб’яднанні, прычым, не толькі ў Беларусі. Вышэйшыя узнагароды Беларусі, ордэн і медаль, таксама названы яго іменем.

Кніжная спадчына Францыска Скарыны- гэта гонар беларускай краіны і народа.

Заявка на участие в районом этапе республиканского конкурса юных журналистов “Ты в эфире”

1. Номинация в конкурсе “Печатные материалы”.
2. Ф.И.О. участника: Телеш Валерия Сергеевна.
3. Название учреждения образования: Государственное учреждение образования “Средняя школа №1 г.п. Россь”.
4. Адрес учреждения образования: г.п. Россь, ул. Красноармейская 39а
5. Электронный адрес: rossschool1@yandex.ru
6. Ф.И.О. педагога: Польцына Елена Николаевна
7. Контактный телефон: 32-3-07

19.10.2017

Директор Т.Н. Муравская